*Дачкі*: Завыганшчышка і Завыганшчынка, Марыля і інш. Рыбачкова, Карусёнчышка, Язэпчышка.

*Імёны мускія*: Ада́сь, –*я* (хлапец), Ада́м, –а́ (малады й сталы), Вінцэсь, –я (сталы й стары), Вінцук, –а́ (малады, сталы й стары), Вінцучок (малы), Віктось, –я (сталы), Лявон, –а (сталы й стары), Пятрусь (хлапец), Пятрук, –а́ (хлапец і мужчына), Сымон, –а (стары), Юзук (малады й сталы); умерлыя старыя: Антось, –я, Вікторы, Габрук (*Gabruk*), Францiш, Юстын, –а́, Ясюк.

*Імёны жаноцкія:* Але́на, Але́нка, Алімка, Аміля, Амілька, Антоля, Га́нька, Зося, Мальвіна, Міхаліна, Марыля, На́ста, Паўліна; умерлая — Ягне́ша. Усімі менаванымі імёнамі жаноцкімі завуць маладых, сталых і старых — бяз розьніцы.

*Насьміханьні, рымаваныя да йімёнаў*:

1) Ада́м, я цябе прадам,
Скуру злуплю — другога куплю.

2) *Ю*за — пуза, галапуза
Драў драніцы,
Лавіў мышы па паліцы,
Мышы ў мох — Юза здох.

*Назовы кароваў*: Бяла́, Краса́, Маліна, Падла́ска, Раба́, Рагуля, Рыжа́, Таўрэлька.

*Сабакі*: Жучок, Лыска, Ра́бчык.

—————————

Гэтак трэба запісаваць географічныя й асабовыя назовы, калі хто запісуе на малой мясцовасьці (местачка, сяло, засьценак і пад.). Пры запісах назоваў на вялікшым прасторы, прыкладам, у цэлым павеце, можна абмежыцца запісаваньням адно местачкаў, сёлаў (вёскаў), засьценкаў і двароў. Шмат ляпей, калі хто выбірае малую мясцовасьць і запісуе на ейным прасторы ўсі чыста назовы.

<…>

## *4.2. Тапаніміка*

# Маленькая ўвага

Наша беларуская інтэлігенцыя часта даведываецца назвы сваіх мест і мясцовасьцяў с чужой літэратуры, а дзеля таго, што чужынцы (палякі і расейцы) перакручываюць назовы нашых мест на свой лад, зацемняючы гэтым значэньне самага слова, дык і чуваць нярэдка гэткіе дзіўные з вуснаў беларуса словы, як: Гродна, замест Горадня, як гэта старое беларускае места звалося с XIII веку і як цяпер завуць яго жыхары Горадненскага, Сакольскага і Беластоцкага паветаў. Часам нават чуваць Дамброва, як перакручываюць палякі, замест праўдзівага Дуброва (мястэчка Сакольск. п.), як усе жыхары Сакольскага павету яго называюць. Здараецца чуць Валкавыск, як кажуць чужынцы, замест, як кажуць самі ваўкавышчане, Ваўкавыск. Трэба казаць Менск, Меншчына і г.д., бо гэтак кажуць менчане, а ня Мінск і г.д., таксама трэба казаць Полацак і Слуцак, а ня Полацк і Слуцк. Трэба казаць Нёман, каля Нёмна і г.д., бо гэтак завуць гэту беларускую раку ўсе прынёманскіе жыхары, а ня Неман, як нема ведама чаму завуць яе расейцы і палякі.